15070435
63.3(4Беі-4Брэ)
П15

# ПАМЯЦЬ

15070435
63.3(4Беі-4Брэ)
П15

# ПАМЯЦЬ

## ПІНСКІ РАЁН

**МІНСК
БЕЛТА
2003**

07 12 18

УДК 947.6
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.К.КІСЯЛЁЎ (галоўны рэдактар выдавецкага цэнтра БЕЛТА), Ф.П.КАРАЛЬЧУК,
Дз.Р.ЛЕМЯШЭЎСКІ, В.В.САШКО, Б.В.УЛЬЯНКА

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

Дз.Р.ЛЕМЯШЭЎСКІ (старшыня камісіі), Ф.П.КАРАЛЬЧУК (намеснік старшыні),
В.М.КЛЁША (сакратар камісіі), Р.В.АКІМАЧКІНА, П.Я.ЖУРКОЎ, І.Я.ЗАВАЦКАЯ,
Э.Л.ЗЛОБІН, М.Л.САЎЧАНКА, К.С.СЕВЯРЫН, В.Ц.СУЛІМА, Т.С.ШЧАРБАКОВА

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ:

Б.В.УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), У.І.ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М.З.БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар)

Мастак
Э.Э.ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі
В.А.РАГАЛЕВІЧА

Установа культуры
«Абласная бібліятэка
імя М. Горкага»
г. Брэст

ISBN 985-6302-48-X

© БЕЛТА, 2003



Пінскія краявіды.

| | |
|---|---|
| 30 — 20 тысяч гадоў таму. | Гэтым часам датуецца стаянка старажытнага чалавека, выяўленая каля Юравіч. |
| Сярэдзіна 1-га тысячагоддзя н.э. | Рассяленне на поўдні Беларусі раннеславянскіх плямён пражскай археалагічнай культуры. |
| VIII — X ст. | Гэтым часам датуюцца гарадзішча і селішча ў в. Гарадок, селішчы каля вёсак Курадава, Крывічы, Церабень, Камень, Лемяшэвічы, Пагост-Загародскі, курганныя могільнікі каля вёсак Вылазы, Лемяшэвічы і інш. |
| 1097 г. | Першае пісьмовае ўпамінанне пра Пінск. |
| Да сярэдзіны XII ст. | Пінск у складзе Тураўскага княства, адзін з яго важнейшых гарадоў. |



С.Ф.Дубянецкі.

«Удасканаленне сістэмы кармлення маладняку буйной рагатай жывёлы на адкорме». У 1989 г. становіцца прафесарам кафедры кармлення сельскагаспадарчай жывёлы, а ў 1990 г. — загадчыкам гэтай кафедры.

Б.М.Гут паспяхова сумяшчаў педагагічную працу з навуковай. Ён апублікаваў 131 навуковую працу, сярод якіх «Метады ацэнкі спажыўных кармоў» (1978), «Прамысловы адкорм буйной рагатай жывёлы на бразе» (1980), «Адкорм буйной рагатай жывёлы на бразе» (1984, усе выдадзены ў Ленінградзе), «Біялагічныя заканамернасці зніжэння затрат корму на вытворчасць малака і ялавічыны» (1991, Масква) і інш. Вучоны меў некалькі пасведчанняў Дзяржаўнага камітэта СССР па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў. Памёр Б.М.Гут 18.12.1992 г.

*М.Казлоўскі.*

**ДУБЯНЕЦКІ Станіслаў Фёдаравіч.** Беларускі філосаф і палітолаг. Кандыдат філасофскіх навук (1989). Нарадзіўся 1.9.1940 г. у в. Востраў Пінскага раёна. Закончыў Рэспубліканскае культасветвучылішча імя Н.К.Крупскай у Магілёве (1960), Магілёўскі педагагічны інстытут (1966), Мінскую вышэйшую партыйную школу (1973). З 1957 г. загадчык Вастраўскага сельскага клуба, загадчык бібліятэкі і настаўнік Ласіцкай сярэдняй школы. З 1961 г. працаваў на Ганцаўшчыне настаўнікам матэматыкі, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Чудзінскай сярэдняй школы, інспектарам райана, загадчыкам кабінета палітасветы — намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Ганцавіцкага райкома КПБ. З 1973 г. намеснік загадчыка Дома палітычнай асветы Брэсцкага абкома КПБ, з 1979 г. інструктар аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ. У 1989 – 1993 гг. працаваў старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута філасофіі і права Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. З 1994 г. загадчык рэдакцыі філасофіі, эканомікі і права выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі. Аўтар кніг «Цэнтры творчай думкі» (1982), «Школа класавага выхавання: З вопыту палітычнай адукацыі працоўных» (1985), «Цяжкі шлях да адраджэння» (1997, разам з Э.С.Дубянецкім), навуковых прац, канцэптуальных артыкулаў па філасофіі, паліталогіі, гісторыі філасофскай і грамадскай думкі ў 18-томнай Беларускай энцыклапедыі, якая выдаецца з 1996 г. Адзін са стваральнікаў і аўтараў даведнікаў «Беларусь» (1995), «Чалавек і грамадства» (1998), «Асветнікі зямлі Беларускай» (2001), «Рэлігія і царква на Беларусі» (2001) і інш. Правадзейны член (акадэмік) Беларускай акадэміі сацыяльных навук з 1999 г. Жыве ў Мінску.

**КАХНЮК Віктар Ціханавіч.** Беларускі вучоны ў галіне анкалогіі. Доктар медыцынскіх навук (1995). Нарадзіўся 24.3.1953 г. у в. Кончыцы Пінскага раёна. Закончыў Мінскі медыцынскі інстытут (1982). З 1982 г. у НДІ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі. Аўтар навуковых прац па дыягностыцы, лячэнні і рэабілітацыі анкалагічных хворых. Жыве ў Мінску.

**КОЛБ Уладзімір Гаўрылавіч.** Беларускі вучоны ў галіне біяхіміі. Доктар медыцынскіх навук (1970), прафесар (1972). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1990). Нарадзіўся 12.3.1929 г. у в. Лемяшэвічы Пінскага раёна. Закончыў Мінскі медыцынскі інстытут (1955). З 1958 г. загадчык біяхімічнага аддзела Беларускага НДІ туберкулёзу, з 1970 г. загадчык кафедры клінічнай лабараторнай дыягностыкі Беларускага інстытута ўдасканалення ўрачоў. Аўтар навуковых прац па біяхіміі і імуналогіі, лёгачнай і сардэчнай паталогіі, дыягностыцы і метадах даследавання ў нефралогіі і уралогіі, хірургічных захворванняў.

**ЛОКУН Валянціна Іванаўна.** Беларускі літаратуразнавец. Кандыдат філалагічных навук (1984). Нарадзілася ў 1946 г. у в. Цепянец Пінскага раёна. Вучылася ў Малоткавіцкай сярэдняй школе. У 12-гадовым узросце дзяўчынку напаткала цяжкая хва-

роба, у выніку якой яна была асуджана на нерухомасць. У 1966 г. закончыла Пінскую завочную школу з залатым медалём і была прынята на філалагічны факультэт (аддзяленне рускай мовы і літаратуры) Брэсцкага педагагічнага інстытута. Вучылася ў аспірантуры пры БДУ. Аўтар зборніка артыкулаў «Да новых вышынь» (1991), манаграфіі «Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы. 1950-я — 1960-я гады» (1995), шматлікіх артыкулаў па праблемах развіцця беларускай літаратуры. Жыве ў Пінску.

**ПРЫГОДЗІЧ Мікалай Рыгоравіч.** Беларускі мовазнавец. Доктар філалагічных навук (2000). Нарадзіўся 1.1.1953 г. у в. Лышча Пінскага раёна. Закончыў філалагічны факультэт БДУ (1975). Пасля заканчэння аспірантуры з 1979 г. працаваў на кафедры беларускай мовы філалагічнага факультэта БДУ. З 1993 г. загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы. Аўтар больш за 260 навуковых прац, у т.л. 8 манаграфій. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1986). Жыве ў Мінску.

**СЕЛЮЖЫЦКІ Георгій Уладзіміравіч.** Вучоны ў галіне медыцыны і гігіены. Член-карэспандэнт Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук (1990). Кандыдат медыцынскіх навук (1964), прафесар (1964). Нарадзіўся 10.2.1932 г. у в. Бакінічы Пінскага раёна. Закончыў Пінскую фельчарскую школу (1953), Ленінградскі санітарна-гігіенічны медыцынскі інстытут. Быў дэканам санітарна-гігіенічнага факультэта гэтага інстытута. Доўгі час з'яўляўся старшынёй Пецярбургскага таварыства гігіеністаў і санітарных урачоў, рэдкалегіі часопіса «Гігіена і санітарыя». З 1992 г. старшыня Усерасійскага таварыства гігіеністаў і санітарных урачоў. Аўтар звыш 190 навуковых прац, у тым ліку 12 манаграфій, даведнікаў і падручнікаў.

**ФЕДАРОВІЧ Сяргей Уладзіміравіч.** Вучоны ў галіне медыцыны і гігіены. Акадэмік Інжынернай акадэміі навук (1998), Доктар медыцынскіх навук (1986), прафесар (1990). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1995). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі 2002 г. Нарадзіўся 22.5.1959 г. у в. Малыя Дворцы Пінскага раёна. Закончыў Пінскае медвучылішча (1958), Ленінградскі санітарна-гігіенічны медыцынскі інстытут (1967). Аўтар звыш 180 навуковых прац, у тым ліку 11 манаграфій.

**ШАЎЧУК Іван Іванавіч.** Вядомы селекцыянер. Нарадзіўся 30.1.1887 г. у Пінску. Пасля заканчэння Пінскага рэальнага вучылішча (1905) працаваў у праўленні Палескай, з 1918 г. Мурманскай чыгунак. У 1923 г. вярнуўся на радзіму, займаўся вырошчваннем цеплалюбівых раслін (вінаград, персік, абрыкос, грэцкі арэх), якія не культываваліся на Піншчыне. Да вайны ў яго расло звыш дваццаці гатункаў вінаграду. З 1948 г. загадчык Пінскага апорнага пункта па культуры вінаграду Беларускай плодаагародніннай выпрабавальнай станцыі пры НДІ бульбаводства і плодаагародніцтва. Распрацаваў тэхналогію вырошчвання вінаграду ў Беларусі, вывучыў больш за 150 яго гатункаў. Асабіста вывеў некалькі гатункаў вінаграду, абрыкос «Пурпурны» і інш. Памёр 10.3.1965 г.

**ШПАКОЎСКІ Іван Сцяпанавіч.** Беларускі літаратуразнавец, крытык. Кандыдат філалагічных навук (1967). Нарадзіўся 14.8.1936 г. у в. Мясяцічы Пінскага раёна. Пасля заканчэння Брэсцкага педінстытута (1959) працаваў настаўнікам, дырэктарам Грыўкавіцкай сямігадовай школы (Пінскі раён), літсупрацоўнікам газеты «Сцяг перамогі» (г. Маларыта, 1960 — 1961), дырэктарам і настаўнікам Маларыцкай вячэрняй школы (1962 — 1964), старшым выкладчыкам Брэсцкага педінстытута (1964 — 1965). У 1962 — 1964 гг. вучыўся ў аспірантуры Кіеўскага універсітэта (спачатку завочна, потым на стацыянары). З 1966 г. працаваў у Нежынскім педінстытуце асістэнтам кафедры рускай літаратуры, старшым выкладчыкам. У 1968 — 1969 гг. в.а. дацэнта кафедры рускай літаратуры БДУ. З 1969 г. у Інстытуце літаратуры імя Я.Купалы АН Беларусі, малодшы, потым старшы навуковы супрацоўнік. У 1988 г. дацэнт Кіеўскага, з 1989 г. — Мінскага педінстытута (з 1993 г. Беларускі педагагічны універсітэт). Піша на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах. Літаратурную дзейнасць І.Шпакоўскі пачаў з рэцэнзій на зборнікі паэзіі, кінафільмы, спектаклі. Яго першая публікацыя — артыкул «Кнігу — у масы» (газ. «Сцяг перамогі», 29.3.1961). У коле яго навуковых інтарэсаў — праблемы вобразнасці, майстэрства, тыпізацыі, стылёвага развіцця паэзіі. Разглядае індывідуальныя асаблівасці стылю Р.Барадуліна, А.Вярцінскага, В.Зуёнка, У.Караткевіча, А.Куляшова, П.Панчанкі, А.Пысіна, М.Тан-

## Змест

Да чытача ........ 17
Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ........ 19
Ахоўныя прыродныя тэрыторыі і аб'екты ........ 22
Блакіт Піншчыны ........ 25

**Ад часоў першабытных — 1917**

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ ........ 31
Археалагічныя помнікі і знаходкі на тэрыторыі Пінскага раёна ........ 43
Дакументы сведчаць ........ 53
Пінскае княства ........ 54
У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ........ 55
Дакументы сведчаць ........ 66
З гісторыі шляхецтва ........ 72
Іх імёны ў гісторыі Піншчыны ........ 74
У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ ........ 81
Дакументы сведчаць ........ 88
Няпростыя адносіны з царквой ........ 90
Піншчына ў час вайны 1812 г. ........ 91
Дакументы сведчаць ........ 96
Пінскія паўстанцы ........ 104
Піншчына на мяжы стагоддзяў ........ 106
Так жылі раней у Стаўку ........ 109
Аднаўлялася Палессе ........ 109
Дакументы сведчаць ........ 112
Іх імёны ў гісторыі Піншчыны ........ 118
Якуб Колас у Пінкавічах ........ 132
Пінскія шляхі Максіма Гарэцкага ........ 134
Блок і Піншчына ........ 134
Палескі след Гумілёва ........ 141
Аэрастат над Палессем ........ 144

**1917—1941**

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ ........ 145
Зарава над Палессем ........ 149
Дакументы сведчаць ........ 149

Як быў вызвалены Пінск ... 153
Актыўныя ўдзельнікі барацьбы за савецкую ўладу ... 156
У СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ ... 157
Дакументы сведчаць ... 166
Па старонках пінскіх газет (1920—1930-я гады) ... 173
З гісторыі Пінскай рачной флатыліі ... 178
Іх імёны ў гісторыі Піншчыны ... 182
Пры новай уладзе ... 189
Дакументы сведчаць ... 191
Трагедыя ў Парэччы ... 195
Арышты і дэпартацыі (1939—1941) ... 197
Жыхары Пінскага раёна, якія загінулі ў час савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. ... 215

**1941—1945**

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ ... 216
Так пачыналася ... 216
У першыя дні вайны ... 218
З экіпажа застаўся адзін ... 224
З гісторыі Пінскай рачной ваеннай флатыліі (1940—1941) ... 224
Акупацыйны рэжым ... 227
Дакументы сведчаць ... 232
Жудасная расправа ... 239
Домам стаў «Воўчы лес» ... 240
Норма — чатырнаццаць ваганетак ... 241
Падполле дзейнічае ... 242
Партызанскі фронт ... 245
Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі Пінскага раёна ... 251
Партыйныя і камсамольскія падпольныя органы ... 257
Партызанскія камандзіры ... 258
Дакументы сведчаць ... 265
Народная барацьба супраць фашысцкіх акупантаў на Піншчыне ... 272
Права весці за сабой ... 274
Атрад імя Івана Чуклая ... 277
Бой пад Сошна ... 279
Мае баявыя сябры ... 279
208-ы партызанскі ... 280
Дапамагалі мясцовыя жыхары ... 281
Агульная мэта ... 282
Браты па зброі ... 284
У пінскіх лясах ... 286
Крылатыя сябры ... 290
Разведчык Аляксей Кот ... 290
З крыжам супраць акупантаў ... 290
Газетным радком ... 292
Вызваленне ... 294
Дакументы сведчаць ... 297
На берагах Ясельды ... 298
Бой над Пагосцкім возерам ... 299
З задання не вярнуліся ... 300
Камсорг Мікалай Баброўскі ... 301

Вызначыліся пры вызваленні Піншчыны ........ 302
Пінчукі на франтах Айчыннай ........ 306
Вярнуліся параможцамі ........ 310
АХВЯРЫ ВАЙНЫ ........ 344
Загінуўшыя партызаны, удзельнікі антыфашысцкага падполля, асобы, якія актыўна садзейнічалі партызанскаму руху і падполлю, члены іх сем'яў, мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору ........ 344
Воіны Чырвонай арміі, якія загінулі пры вызваленні Пінскага раёна і пахаваны на яго тэрыторыі ........ 371
Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны ........ 384

## 1945 — да нашых дзён

У МІРНАЙ ПРАЦЫ ........ 429
Дзеці вайны ........ 450
Загінулі ад рук бандытаў ........ 452
Летапіс, адліты ў радок ........ 456
Вызначыліся працай ........ 457
Яны нарадзіліся на Піншчыне ........ 483
Лёсам звязаны з краем ........ 497
Загінулі ў Афганістане ........ 498
Ваеннаслужачыя, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў ........ 501
Яны кіравалі раёнам ........ 502
На шляху ў XXI стагоддзе ........ 503
З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ ........ 506
Помнікі культавай і сядзібна-паркавай архітэктуры ........ 506
З гісторыі канфесій ........ 529
Купяцкі манастыр і яго цудатворны абраз ........ 532
Лышчанскі цудатворны абраз ........ 533
Навадворскі манастыр ........ 536
Касцёл каля возера ........ 537
Нарубы вёскі Парэ ........ 538
Легенды і паданні роднага краю ........ 540
Даследчыкі Піншчыны ........ 544
Народнае мастацтва Піншчыны ........ 548
Душы ўзвышаны палёт ........ 552
Народныя фальклорныя калектывы ........ 553
Узорныя калектывы ........ 556
Грамадскія музеі раёна ........ 556
Помнікі гісторыі і культуры ........ 558
З гісторыі населеных пунктаў ........ 569
Замест эпілога ........ 617

15070435
Установа культуры «Абласная бібліятэка імя М. Горкага» г. Брэст

**Прадстаўнікі грамадскасці, якія прымалі ўдзел у пошуку, зборы, падрыхтоўцы і напісанні матэрыялаў для кнігі «Памяць. Пінскі раён»:**

І.І.Акінчыц, В.С.Вяргей, М.С.Дваракоўская, Т.П.Дзем'янец, І.Э.Яленская, А.У.Ерашэвіч, У.В.Здановіч, В.Л.Ільянкоў, Г.С.Казубоўская, А.С.Кірыковіч, В.Ц.Кірыковіч, С.М.Лазюк, Н.В.Лушчыцкая, А.В.Марчанка, Г.І.Міховіч, Д.А.Перац, З.Ф.Пітунова, Я.П.Пчолка, В.М.Сідаровіч, А.С.Скаржынец, С.Г.Харашаўцаў, В.А.Цвяткоў, І.А.Шумак.

**Старшыні сельскіх і пасялковага Саветаў, якія дапамагалі і садзейнічалі ў зборы матэрыялаў для кнігі:**

І.І.Бабіч, М.М.Барычэўская, Г.Г.Батвінка, М.М.Башчук, Н.Ф.Даніловіч, Л.М.Дубнавіцкі, Г.А.Жук, М.П.Жукаў, В.Я.Зубко, У.І.Ігнаценка, В.І.Калавур, В.М.Клімавец, М.Ф.Корань, С.Ф.Куніцкі, А.А.Кухарэвіч, Л.А.Літвінчук, У.У.Наўныка, В.М.Новак, М.М.Пашкевіч, Г.І.Піскун, С.П.Сідарэвіч, С.В.Уздзякін, М.А.Федарашка, В.А.Шаўчук, С.П.Шаўчук, І.І.Яруціч.

**Супрацоўнікі выдавецкага цэнтра БЕЛТА, якія працавалі над кнігай:**

Г.К.Кісялёў — галоўны рэдактар, Л.М.Драбовіч — намеснік галоўнага рэдактара, З.І.Малейка — навуковы рэдактар, В.І.Багдановіч, Л.І.Рудніцкая — літаратурныя рэдактары.

**Фота:** Л.А.Дубнавіцкага, М.В.Лінкевіча, У.П.Сівалапа, К.А.Чабатарова (каляровыя здымкі), з фондаў Музея Беларускага Палесся, фотатэкі БЕЛТА, з грамадскіх і асабістых архіваў, друкаваных крыніц.

**Картограф** Г.І.Паўлянковіч.

**Памяць:** Гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. — Мн.: БЕЛТА,
**П15** 2003. — 624 с.: іл.

ISBN 985-6302-48-Х.

Кніга асвятляе багатую гісторыю Піншчыны ад старажытных часоў да нашых дзён. У хроніцы выкарыстаны дакументы і матэрыялы з архіўных, музейных і друкаваных крыніц, у яе ўключаны абагульняючыя гістарычныя нарысы, артыкулы, успаміны і іншыя матэрыялы пра найбольш цікавыя падзеі ў жыцці раёна, яго знакамітых людзей, якія праславілі гэты край сваёй баявой, працоўнай і творчай дзейнасцю.

Значная частка хронікі прысвечана перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Прыводзяцца спісы партызан, падпольшчыкаў, воінаў Чырвонай арміі, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору.

Прыводзяцца таксама звесткі пра жыхароў раёна, якія сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій і пазней былі рэабілітаваныя. Асобны раздзел кнігі прысвечаны апісанню багатай матэрыяльнай і культурнай спадчыны Піншчыны, гісторыі яе населеных пунктаў.

Кніга будзе карыснай усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

**ББК 63.3 (4 Беи)**